Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
___________ Н.У.Карчэўская
«30» 06 2025 г.
Рэгістрацыйны № ВД-6-69 эвуч.

# ГІСТОРЫЯ СЛАВЯНСКІХ НАРОДАЎ

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці:*
*6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны*

2025

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі АСВА 6-05-0322-03-2023 па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны, зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 21.08.2023 № 274, вучэбных планаў БДУКМ па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

**СКЛАДАЛЬНІК**

*Л. У. Ландзіна*, доктар гістарычных навук, дацэнт, прафесар кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў".

**РЭЦЭНЗЕНТЫ**

*С. А. Талмачова*, доктар гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М. Танка";

*А. П. Нарыжная*, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, прафесар кафедры філасофіі, гісторыі і метадалогіі адукацыі дзяржаўнай ўстановы адукацыі "Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы"

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* гісторыка-культурнай спадчыны установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 6 ад 28.03.2025);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 17.04.2025)

**УЗГОДНЕНА**

Загадчык аддзела экспазіцыйна-выставачнай работы
дзяржаўнай установы «Музей гісторыі горада Мінска»,
кандыдат культуралогіі

____________________________ Ю.В.Кавалёва

Верно

Для документов

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі АСВА 6-05-0322-03-2023 па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны, зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 21.08.2023 № 274, вучэбных планаў БДУКМ па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

**СКЛАДАЛЬНІК**

*Л. У. Ландзіна*, доктар гістарычных навук, дацэнт, прафесар кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў".

**РЭЦЭНЗЕНТЫ**

*С. А. Талмачова*, доктар гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М. Танка";

*А. П. Нарыжная*, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, прафесар кафедры філасофіі, гісторыі і метадалогіі адукацыі дзяржаўнай ўстановы адукацыі "Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы"

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* гісторыка-культурнай спадчыны установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 6 ад 28.03.2025);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 17.04.2025)

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна “Гісторыя славянскіх народаў” з’яўляецца неад’емнай часткай сукупнасці трох вучэбных дысцыплін гістарычнага цыклу, ў лік якіх таксама ўваходзяць “Гісторыя Беларусі” і “Усеагульная гісторыя”.

Гісторыя славянскіх народаў займае пры гэтым асаблівае месца па прычыне прыналежнасці Беларусі да славянскага свету. У культурным і геапалітычным аспектах Беларусь непасрэдна мяжуе і гістарычна звязана з усходнеславянскімі краінамі – Расіяй і Украінай, а таксама з дзяржавай заходніх славян – Польшчай, гісторыю якіх ведаць неабходна, у тым ліку для разумення актуальных рэалій. Паўднёвыя, усходнія і заходнія славяне складаюць цывілізацыйную супольнасць, якая мае адметныя культурныя рысы і арганічна ўключана ў еўрапейскі і сусветны гістарычны працэс.

У сучасным грамадстве вывучэнне і веданне айчыннай гісторыі і гісторыі сваіх бліжэйшых суседзяў накіравана на фарміраванне асобы, якая павінна свядома арыентавацца ў грамадска-палітычным і культурным жыцці, разумець і аналізаваць тэндэнцыі і працэсы мінулага і сучаснасці. У максімальнай ступені актуальнымі з’яўляюцца веды па гісторыі славянскіх народаў для будучых спецыялістаў у сферы музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны па прычыне самай цеснай уключанасці адзначанай галіны ў гістарычны працэс.

Прапануемая для студэнтаў вучэбная дысцыпліна прадугледжвае разгляд сацыяльна-палітычных, геапалітычных, эканамічных, культурных і рэлігійных працэсаў, якія разгортваліся ў славянскім свеце ад старажытнасці да нашых дзён. У адпаведнасці з прынцыпам гістарызму і гісторыка-генетычным метадам матэрыял выкладаецца ў храналагічнай паслядоўнасці, разглядаюцца сацыяльна-эканамічныя, палітычныя, культурныя аспекты развіцця славянскай супольнасці і асобных краін. Асобна аналізуюцца праблемы, якія мелі агульнагістарычнае значэнне. Значная ўвага нададзена матэрялу ў рэчышчы парадыгмы культурнай антрапалогіі.

*Мэтай* выкладання вучэбнай дысцыпліны “Гісторыя славянскіх народаў” з’яўляецца фарміраванне прафесійных кампетэнцый будучых спецыялістаў у галіне музеязнаўства і аховы гісторыка-культурнай спадчыны ў кантэксце вывучаемай вучэбнай дысцыпліны, матывацыі для набыцця новых ведаў і іх прымянення ў прафесійным і штодзенным асяроддзі.

*Задачамі* вучэбнай дысцыпліны з’яўляюцца:

–вызначэнне месца і ролі славянскага свету ў агульнаеўрапейскім і сусветным гістарычным працэсе;

– выяўленне спецыфічных рыс развіцця славянскіх народаў, а таксама асаблівасцей гістарычнага шляху усходніх, заходніх і паўднёвых славян і іх стасункаў паміж сабой і іншымі народамі і дзяржавамі;

– усведамленне цэласнасці сусветна-гістарычнага працэсу, сувязі і пераемнасці ў развіцці цывілізацый, краін і народаў;

– адлюстраванне паступовага разгортвання гістарычнага развіцця з выяўленнем краін – лідэраў у канкрэтныя эпохі, з разуменнем нераўнамернасці і пераемнасці гэтага працэса;

сістэмнае бачанне гістарычнага працэса праз сінхранізацыю, аналогіі, параўнанне, вылучэнне сувязяў прычын і наступстваў;

– выхаванне павагі да гісторыка-культурнай спадчыны розных народаў, суаднясенне дасягненняў сусветнай і айчыннай матэрыяльнай і духоўнай культуры;

– забеспячэнне пераемнасці і ўзаемасувязі матэрыяла выкладаемага курса з ведамі, атрыманымі ў сярэдняй школе, а таксама са зместам сумежных вучэбных дысцыплін праз міжпрадметныя сувязі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт *павінен ведаць:*

– месца гісторыі славянскіх народаў у сусветнай гісторыі, крытэрыі перыядызацыі, змест асобных перыдаў;

–асноўныя тэндэнцыі, працэсы і падзеі ў развіцці цывілізацый, краін і народаў;

– асаблівасці развіцця заходняй і усходняй цывілізацыйнай мадэлі;

– уплыў сацыяльных і культурных інстытутаў, якія склаліся ў ранейшыя перыяды, на гістарычныя працэсы наступных часоў.

Студэнт павінен *валодаць:*

– навыкамі сістэматызацыі атрыманых ведаў;

– уменнем генерыраваць новыя ідэі і ўкараняць іх у практычную дзейнасць;

– творчым падыходам да вывучэння, інтэрпрэтацыі і трансляцыі гісторыка-культурнай спадчыны славянских народаў.

Студэнт павінен *умець:*

–параўноўваць і інтэрпрэтаваць розныя пункты гледжання, выпрацоўваць і аргументаваць уласныя меркаванні;

–чытаць інфармацыю гістарычных карт, схем, дыяграм, а таксама ілюстрацыйнага матэрыялу;

–прымяняць у кантэксце разгляду гісторыі славянскіх народаў веды па сумежных вучэбных дысцыплінах (усеагульнай і айчыннай гісторыі, сусветнай мастацкай культуры, філасофіі, сусветнай літаратуры, рэлігіязнаўстве, культуралогіі і і г.д.);

–аналізаваць гістарычныя працэсы і падзеі, ацэньваць гістарычныя з'явы і персаналіі.

Зместам вучэбнай дысцыпліны "Гісторыя славянскіх народаў" прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый:

– Працаваць у камандзе, талерантна ўспрымаць сацыяльныя, канфесійныя, культурныя і іншыя адрозненні;

– Валодаць здольнасцю аналізаваць працэсы дзяржаўнага будаўніцтва ў розныя гістарычныя перыяды, выяўляць фактары і механізмы гістарычных змен, вызначаць сацыяльна-палітычнае значэнне гістарычных падзей (асоб, артэфактаў і сімвалаў) для сучаснай беларускай дзяржаўнасці, дасканала

выкарыстоўваць выяўленыя заканамернасці ў працэсе фарміравання грамадзянскай ідэнтычнасці;

– Вызначаць і аналізаваць асноўныя этапы, фактары і заканамернасці гістарычнага развіцця грамадства для фарміравання грамадзянскай пазіцыі;

– Аналізаваць і ацэньваць асноўныя гістарычныя падзеі і працэсы, дасягненні сусветнай і айчыннай культуры, агульныя заканамернасці фарміравання культурнай спадчыны;

– Інтэрпрэтаваць гісторыю сусветных цывілізацый, вызначаць асаблівасці этнічных супольнасцей, культур і іх эвалюцыю, агульную сацыякультурную сітуацыю.

У рамках адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне студэнт павінен не толькі набыць тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свій каштоўнасна-асабасны, духоўны патэнцыял сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелы ў сацыяльна-культурным жыцці краіны.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Гісторыя славянскіх народаў” усяго прадугледжана 330 гадзін, з іх аўдыторных – 166 гадзін. Прыкладнае размеркаванне аўдыторныхх гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 98 гадзін, семінарскія заняткі – 68 гадзін.

Форма правядзення бягучай атэстацыі – вуснае апытанне. Форма правядзення прамежкавай атэстацыі – экзамен.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Уводзіны

Гісторыя славянскіх народаў як неад'емная частка ўсеагульнай гісторыі. Месца і своеасаблівасць славянскай цывілізацыі. Геапалітычныя дэтэрмінанты развіцця славянскіх народаў. Уплыў суседзяў на складанне і развіццё славянскіх дзяржаў. Падыходы да перыядызацыі гісторыі славянскіх народаў.

Крыніцы па гісторыі славянскіх народаў. Асноўныя накірункі развіцця гістарыяграфіі славянскіх народаў. Актуальныя праблемы сучаснай гістарыяграфіі гісторыі славянскіх народаў.

## Раздзел I. Славянскія народы ў перыяд Сярэднявечча

### Тэма 1. Славянскі свет ў раннім Сярэднявеччы

Славяне як прадстаўнікі індаеўрапейскай моўнай сям'і. Першыя ўзгадванні пра славян. Канцэпцыі паходжання славян. Міграцыйныя і аўтахтоныя тэорыі паходжання славян.

Сінтэзны і бессінтэзны шляхі феадалізацыі Еўропы. Арэал і асаблівасці фарміравання бессінтэзнага варыянта феадалізацыі. Бессінтэзны варыянт феадалізацыі як фактар развіцця заходніх і ўсходніх славян.

Славяне і іх суседзі. Міграцыйныя працэсы ў Еўропе падчас Вялікага перасялення народаў. Падзел славян на усходніх, паўднёвых і заходніх. Буйнейшыя археалагічныя культуры славян.

Сацыяльны лад, гаспадарчыя заняткі і рэлігійныя вераванні славян у раннім Сярэднявеччы.

### Тэма 2. Першыя славянскія дзяржавы

Разлажэнне радавога ладу і з'яўленне сацыяльнай і маёмаснай дыферэнцыяцыі ў грамадствах славян у канцы жалезнага веку. Лад "ваеннай дэмакратыі", фарміраванне ўлады племянных правадыроў. Славініі.

Даціроўка першых славнскіх дзяржаўных утварэнняў. Дзяржва Сама, яе лакалізацыя і этнічны склад. Версіі аб паходжанні і асобе Сама. Дзяржава Сама і яе адносіны з франкамі. Распад дзяржавы Сама.

### Тэма 3. Першае Балгарскае царства

Балгарскае царства – першая дзяржава паўднёвых славян. Вялікая Булгарыя. Протабалгары. Аварскі і Хазарскі каганаты. Падзел Вялікай Булгарыі пасля смерці хана Кубрата і войны з хазарамі. Міграцыя балгар за Дунай. Балгары і славяне. Заснаванне Першага балгарскага царства ханам

Аспарухам. Першае Балгарскае царства і Візантыя.

Балгарскае царства ў VIII–IX ст. Войны і саюзы з Візантыяй. Удзел балгар у разгроме арабаў. Дынастычная барацьба і заснаванне новай дынастыі ханам Крумам. Пашырэнне тэрыторыі і войны з Візантыяй. Кіраванне хана Амуртага, пашырэнне тэрыторыі краіны, будаўніцтва, ваенная рэформа. Дынастычная барацьба пасля смерці Амуртага. Пачатак хрысціянства, войны з Візантыяй, выхад краіны да Міжземнага мора. Цар Барыс і хрысціянізацыя Балгарыі. Дзейнасць Кірылы і Мефодзія. "Залатое стагоддзе" Балгарыі пры Сімяоне Вялікім. Супрацьстаянне з Візантыяй. Прызнанне Візантыяй незалежнасці Балгарыі. Пашырэнне Балгарскай дзяржавы пры Сімяоне. Працяг супрацьстаяння з Візантыяй, барацьба з венграмі. Паходы супраць Балгарыі рускага князя Святаслава. Барацьба з Візантыяй і заканчэнне Першага Балгарскага царства.

## Тэма 4. Стварэнне і развіццё Чэшскай дзяржавы ў раннім і высокім Сярэднявеччы

Вялікая Маравія – першая дзяржава заходніх славян. Лакалізацыя і этнічны склад. Дынастыя Моймiравічаў. Князь Прыбіна – першы славацкі правіцель. Барацьба Вялікай Маравіі з Усходнефранкскім каралеўствам. Рост Вялікамараўскай дзяржавы пры князі Святаполку. Дзейнасць у Маравіі Кірылы і Мефодзія. Нашэсце венграў і гібель Вялікамараўскай дзяржавы.

Стварэнне Чэшскай дзяржавы і яе геаграфічная лакалізацыя. Легендарныя заснавальнікі Чэшскай дзяржавы. Пачатак дынастыі Пржэмысловічаў. Князь Баржывой і прызнанне за ім тытула князя ўсіх чэхаў. Прыняцце чэхамі хрысціянства і пачатак культавага дойлідства. Супраціўленне хрысціянізацыі. Спыцігнеў I, барацьба з венграмі, саюз з Баварыяй, умацаванне незалежнасці Чэхіі. Дынастычная барацьба. Св. Людміла і св. Вацлаў – правіцелі і хрысціянскія пакравіцелі Чэхіі.

Дынастычная барацьба і далучэнне суседзяў (Польшчы і германскіх імператараў) да праблем Чэшскай дзяржавы. Польскі кароль Баляслаў Храбры і яго барацьба ха польскі трон. Ўзрастанне ролі магнатаў і рыцараў. Імперыя і чэшскія князі. Атрыманне Уладзіславам II каралеўскага тытула ад Фрыдрыха Барбаросы. Паходы на Венгрыю, дыпламатычныя адносіны з Візантыяй. Бржэціслаў I, актыўная знешняя палітыка і ўсталяванне парадку заняцця каралеўскага трона. Барацьба з Польскім каралеўствам за Сілезію. Пашырэнне ўмяшальніцтва германскіх імператараў ва ўнутраныя справы Чэхіі падчас дынастычных усобіц. Чэхія ў крыжовых паходах. Пшэмысл Аттакар і яго ўдзел у барацьбе германскіх князёў за імператарскую карону. Прэрагатывы чэшскага караля адпаведна граматам 1198 і 1212 гг.

Ператварэнне Чэхіі ў спадчынную манархію. Статус Чэшскага каралеўства ў сістэме Свяшчэннай Рымскай імперыі. Асаблівасці статусу манарха ў Чэшскім каралеўстве. Змаганне караля з панамі і ўладыкамі. Умацаванне буйнога свецкага і царкоўнага землеўладання. Германізацыя Чэшскага каралеўства.

## Тэма 5. Старажытнаруская дзяржава (Кіеўская Русь) у IX–XIII ст.

Рассяленне ўсходнеславянскіх пляменаў на тэрыторыях сучасных Расіі, Украіны і Беларусі. Змешванне іх з мясцовым этнічным субстратам. Стварэнне буйных славянскіх племянных саюзаў. Славія, Куявія, Артанія як буйныя супольнасць ўсходнеславянскага свету. Кіеў, Полацк, Ноўгарад – буйнейшыя цэнтры усходніх славян. Запрашэнне варагаў. Нарманская тэорыя. Славяне і нарманы. Славяне, хазары і Візантыя. Першыя ўсходнеславянскія славянскія князі. Князь Ігар і драўляне. “Урокі і пагосты” княгіні Вольгі.

Старажытнаруская дзяржава і яе суседзі. Адносіны з Хазарскім каганатам і Візантыяй. Паходы князя Святаслава на Візантыю і Балгарыю. Барацьба князя Уладзіміра за кіеўскі трон. Хрышчэнне Русі і яго наступствы. Старажытнаруская дзяржава пры Яраславе Мудрым і яго нашчадках. Адносіны Ноўгарада, Полацка і Кіева. Міжнародныя сувязі Старажытнарускай дзяржавы. Фактары і ппрычыны феадальнай раздробленасці. Любечскі з’езд князёў. Намаганні Уладзіміра Манамаха і яго сына Мсціслава па захаванні ўлады Кіева над іншымі княствамі. Высылка полацкіх князёў у Візантыю. Распад Старажытнарускай дзяржавы (Кіеўскай Русі) на ўдзелы. Развіццё буйнейшых княстваў. Наўгародская баярская рэспубліка. Паўночна-Усходняя Русь. Андрэй Багалюбскі. Усевалад Вялікае Гняздо. Галицкае і Волынскае княствы ў XII ст. Галіцка-Валынскае княства ў XIII ст.

Грамадскі лад і гаспадарчыя заняткі ўсходніх славян. Фактары і наступствы бессінтэзнага шляху фарміравання феадалізма. Працэс феадалізацыі ва ўсходніх славян. Узмацненне бейнога свецкага і царкоўнага землеўладання. Катэгорыі залежнага насельніцтва. “Руская праўда”.

## Тэма 6. Барацьба ўсходніх славян з крыжакамі і мангола-татарамі ў XIII ст.

З’яўленне крыжакаў ва Усходняй Прыбалтыцы. Славяне і балты. Характар кантактаў. З’яўленне каталіцкіх місіянераў, першыя ваенныя сутыкненніі. Заснаванне Рыгі. Узнікненне ордэна мечаносцаў. Лівонскі ордэн.

Ноўгарад і Пскоў ў першай палове XIII в. Заключэнне ваенных саюзаў славянскіх і балцкіх князёў. Неўская бітва. "Лядовае пабоішча". Стварэне Вялікага Княства Літоўскага. "Русь Літоўская".

Стварэнне Мангольскай дзяржавы і разгортванне мангольскіх заваёў. Бітва на рацы Калцы. Нашэсце Батыя. Падзенне Кіева. Узнікненне Залатой Арды. Устанаўленне ардынскага панавання, яго змест і наступствы. Паўночна-Усходняя Русь у другой палове XIII ст. Княжэнне Аляксандра Неўскага. "Дюдзенева раць".

## Тэма 7. Стварэнне і развіццё Польскай дзяржавы ў раннім і высокім Сярэднявеччы

Заходнеславянскія плямены і іх рассяленне і легендарныя правіцелі. Заснаванне дынастыі Пястаў. Мешка I. Пашырэнне тэрыторыі дзяржавы, прыняцце хрысціянства па заходняму ўзору, сутыкненне з германскімі імператарамі. Баляслаў Храбры і пашырэнне тэрыторыі. Барацьба з Чэшскай дзяржавай за памежныя землі. Ваенныя паходы Баляслава I і прыняцце ім каралеўскага тытула. Палітычная раздробленасць Польшчы. Усобіцы і страта тэрыторый. Узмацненне дзяржавы пры Казіміры I Аднавіцелі і Баляславе II Смелым. Выступленне Баляслава II на баку Папы рымскага і атрыманне дазволу на каранацыю.

Супраціўленне шляхты і магнатаў мерапрыемтсвам караля. Уступленне краіны ў перыяд усобіц і падзелу дзяржавы. Перамога Баляслава Крываустага ў дынастычных спрэчках і ўмацаванне краіны. Чарговаае аслабленне краіны і яе падзел. Запрашэнне Конрадам Мазавецкім Тэўтонскага Ордэна, стварэнне і рост ордэнскай дзяржавы. Умацаванне дзяржавы пры Уладзіславе Лакетку.

Феадалізацыя і складанне саслоўяў феадальнага грамадства. Сістэма цэнтральнага і мясцовага кіравання. Рост валоданняў духоўных і свецкіх феадалаў. Міграцыйныя і каланізацыйныя працэсы. Гарады і гарадское насельніцтва.

## Тэма 8. Другое Балгарскае царства

Паўстанне пад кіраўніцтвам братоў Асеней і аднаўленне баогарскай дзяржаўнасці. Узмацненне краіны. Цар Калаян і яго знешнепалітычныя поспехі. Бітва пад Адрыянопалем і разгром армій IV крыжовага пахода. Цар Барыл і дэстабілізацыя краіны.

Кіраванне Івана II Асеня і найвышэйшы ўздым Другога Балгарскага царства. Панаванне Балгарыі амаль над усім Балканскім паўвосравам.

Нашэсце на Балнарыю мангола-татар. Аслабленне краіны і паступовае адкладанне тэрыторый (Македонія, Валахія, Фракія і г.д.). Стварэнне

Дабружанскага дэспатата і Відынскага царства. З'яўленне турак-асманаў. Паступовая заваяванне імі Балканскага паўвострава. Падпарадкаванне Відынскага царства і канчатковае заваяванне Другога Балгарскага царства.

## Тэма 9. Маскоўская Русь у познім Сярэднявеччы

Адасабленне зямель Паўночна-Усходняй Русі ад Кіева. Суздальскае і Уладзімірскае княтсвы. Адасабленне Масквы і першыя звесткі аб ёй у летапісах. Юра Далгарукі. Фактары ўзвышэння Масквы і збіранне зямель вакол Маскоўскага княства.

Мерапрыемствы Маскоўскіх князёў па ўмацаванню ўлады і збіранню зямель. Дзейнасць Івана Каліты. Атрыманне маскоўскімі князямі вялікакняскага тытула. Саперніцтва Масквы і Цверы. Масква, Пскоў і Ноўнарад. Адносіны Масквы і Вялікага княства Літоўскага і войны паміж Маскоўскай Руссю і ВКЛ.

Рускія землі ў сістэме Залатой Арды. Сістэма выдачы ярлыкаў і спагнання падаткаў. Кулікоўская бітва. Стаянне на рацэ Вугры і вызваленне ад мангола-татарскага прыгнету.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё. "Судзебнік" Івана III. Пачатак афармлення прыгоннага права. Падзенне Візантыі і фарміраванне ідэі "Масква – трэці Рым". З'яўленне тытула"гасудар усяя Русі".

## Тэма 10. Чэшская дзяржава ў познім Сярэднявеччы

Чэхія пры Вацлаве II. Пашырэнне Чэшскай дзяржавы і валоданне Вацлавам трымя каронамі. Унутранае развіццё Чэшскай дзяржавы. Эканамічнае развіццё і гарады. Рамествы і гарадское самакіраванне. Адкрыццё ў Чэхіі срэбраных радовішчаў. Выпуск пражскага гроша.

Завяршэнне дынастыі Пржэмысловічаў і міжусобная барацьба Умяшальніцтва ў чэшскія справы Рудольфа Габбурга. Генрых Харутанскі і вынікі яго праўлення. Ян Люксеббург і яго шлюб з дачкой Вацлава II.

Росквіт Чэшская дзяржавы пры Яне Люксембургу. Міжнародны статус Чэхіі. Знешнепалітычная экспансія Яна Люксембурга і яго ўдзел у еўрапейскай палітыцы. Вышаградская сустрэча чэшскага, венгерскага і польскага каралёў і яе вынікі. Карл I Люксембург і далейшае ўмацаванне Чэхіі. Гаспадарчае развіццё краіны. Тэрытарыяльнае пашырэнне Чэхіі. Закон 1348 г. аб спадчыннасці чэшскага прастола. "Залатая булла" 1356 г. і яе змест. Чэшскія землі ў сістэме Свяшчэннай Рымскай імперыі.

### Тэма 11. Гусіцкі рух у Чэхіі

Знаходжанне Чэхіі ў складзе Свяшчэннай Рымска імперыі. Германізацыя. Распаўсюджанне рэфармацыйных ідэй. Апазіцыя супраць каталіцкай царквы і германізацыі. Ян Гус і яго вучэнне. Плыні ў гусіцкім руху. Чашнікі і табарыты.

Канстанцкі сабор і яго вынікі. Лёс Яна Гуса і Іераніма Пражскага. Пачатак гусіцкіх войн. Гусіты і іх праціўнікі. Ян Жыжка. Пошук гусітамі падтрымкі ў іншых краінах. Склад гусіцкіх узброеных сіл. Ян Жыжка. Гусіцкія войны і крыжовыя паходы супраць гусітаў. Канфлікт паміж чашнікамі і табарытамі. Войны гусітаў супраць германскіх князёў. Наступствы гусіцкіх войн.

### Тэма 12. Польская дзяржава ў познім Сярэднявеччы

Казімір Вялікі і ўмацаванне каралеўскай улады. Адносіны з вялікім княствам Літоўскім і заходнееўрапейскімі краінамі. Спыненне дынастыі Пястаў і кіраванне Анжуйскай дынастыі. Людовік Венгерскі і яго знашнепалітычная дзейнасць. Эканамічны і культурны росквіт дзяржавы. Барацьба за галіцка-валынскія землі. Асаблівасці сацыяльна-палітычнага развіцця Польскага каралеўства. Роля шляхты. Дынастычныя праблемы. Кошыцкі прывілей і яго наступствы.

Барацьба за польскі трон пасля смерці Людовіка Венгерскага. Крэўская унія і ян наступствы. Развіццё краіны пры першых Ягелонах. Спецыфіка эканамічнага развіцця, сацыяльна структуры, сістэмы землеўладання. Знашнепалітычныя інтэнцыі Польскай дзяржавы. Карона Польская і Вялікае княства Літоўскае. Прававое становішча манарха. Нешаўскія статуты. Петркаўскі статут.

### Тэма 13. Палабскія славяне ў Сярэднявеччы

Тэрыторыя рассялення і групы палабскіх славян. Палабскія плямены як група заходнеславянскіх плямен. Лакалізацыя племянных саюзаў палабскіх славян. Палабскія славяне і іх суседзі. Славяне і германцы. Адносіны з імперыяй Карла Вялікага і Усходнегерманскім каралеўствам.

Экспансія немцаў і датчан у Высокім Сярэднявеччы. Барацьба палабскіх славян з германскімі імператарамі і Свяшчэннай Рымскай імперыяй. Пастповае заваяванне зямель палабскіх славян немцамі. Заснаванне Паўночнай маркі і маркграфства Брандэнбургскага.

Палабскія славяне і датчане. Стварэнне Вендскай дзяржавы. Князь Рацібор і паход славян у Нарвегію. Князь Ніклат, яго барацьба супраць датчан і немцаў. Заснаванне Мекленбургскага дома. Уключэнне зямель

палабскіх славян у сістэму Свяшчэннай Рымскай імперыі, хрысціянізацыя т германізацыя.

### Тэма 14. Паўднёвыя славяне ў Сярэднявеччы

Рассяленне паўднёваславянскіх пляменаў, іх назвы і племянныя саюзы. Суседзі паўднёвых славян. Заваяванне венграмі Прыдунайскай тэрыторыі. Заснаванне Венгерскага каралеўства. Стварэнне дзяржавы харватаў. Заснаванне Сербскай дзяржавы. Сербія ў канкурэнцыі Візантыі і Балгарыі. Далучэнне Сербіі да Візантыі.Ператварэнне Сербіі ў каралеўства пры Стэфане Першавенчаным. Паўднёвыя славяне пад уплывам Візантыі.

З'яўленне турак-асманаў і барацьба супраць іх балканскіх народаў. Бітва на Косавым полі і заваяванне Сербіі. Усталяванне Асманскага панавання над паўднёваславянскімі народамі

### Тэма 15. Культура славянскіх краін у Сярэднявеччы

Славянская міфалогія і язычніцкія вераванні славян да прыняцця хрысціянства. Хрысціянізацыя із'яўленне пісьменнасці ва ўсходніх, заходніх і паўднёвых славян. Кірыл і Мефодый. Усталяванне кірылічнага алфавіта. Першыя хрысціянскія епархіі і з'яўленне мураванага дойлідства. Архітэктурныя школы на землях усходніх, заходніх і паўднёвых славян. Роля манастыроў у распаўсюджанні адукацыі. Манастырскія школы. Сабornасць і манаства.

Летапісанне. "Аповесць мінулых часоў". Эпічныя творы. Рускія быліны.

"Слова аб паходзе Ігаравым". Значэнне сувязяў з Візантыяй для фарміравання дзяржаўнай ідэалогіі Масквы. "Масква – Трэці Рым". Фрэскавы жывапіс. Іконапіс.

## Раздзел II. Славянскія краіны і народы ў перыяд Новага часу

### Тэма 16. Спецыфіка развіцця славянскіх краін і народаў у ранні Новы час

Славянскія краіны ў ранні Новы час. Знаходжанне паздневаславянскіх народаў пад панаваннем Асманскай імперыі. Вылучэнне лідэрства Маскоўскай дзяржавы і аб'яднанне ўсходнеславянскіх зямель вакол Масквы. "Русь Маскоўская" і "Русь Літоўская" і саперніцтва паміж імі. Беларускія і ўкраінскія землі ў складзе Вялікага княства Літоўскага. Украінскія землі у складзе Польшчы. Чэхія ў складзе Свяшчэннай Рымскай імперыі. Геапалітычныя інтарэсы, саюзнікі і сапернікі славянскіх краін.

Умовы і асаблівасці развіцця палітычных інстытутаў у славянскіх

дзяржавах. Фарміраванне самадзяржаўнай манархіі ў Маскоўскім царстве і шляхецкай дэмакратыі ў Кароне Польскай. Сацыяльна структура заходне-і ўсходнеславянскіх краін і яе ўплыў на развіццё палітычных інстытуцый. Канфесіянальная разнастайнасць у славянскіх дзяржавах. Рэгіянальныя асаблівасці эканомікі славянскіх краін як часткі рэгіёна бессінтэзнага варыянта феадалізацыі.

### Тэма 17. Руская дзяржава ў XVI ст.

Тэрыторыя і насельніцтва. Гаспадарчае развіцце. Класы і саслоўныя групы. Сістэма ўлады. Умацаванне дзяржавы пры Іване III і Васілі III. Сутыкненні з Вялікім княствам Літоўскім. “Масква – трэці Рым”. “Выбраная Рада”. Судзебнік 1550 г. Пачатк склікання Земскіх сабораў, іх склад і значэнне. Адмена кармленняў. Апрычніна і яе значэнне. Знешняя палітыка. Далучэнне Казані і Астрахані. Лівонская вайна.

Наспяванне дынастычнага крызісу пасля смерці Івана IV. Барыс Гадуноў. Умацаванне дзяржаўнай улады і кантакты з Захадам. Справа царэвіча Дзмітрыя. “Вялікі голад” 1601–1603 гг.

### Тэма 18. Польшча пры апошніх Ягелонах.

Эканамічнае развіццё. Структура землеўладання. Гарады. Катэгорыі залежнага насельніцтва. Саслоўныя групы і асаблівасці іх прававога становішча. Палітычная сістэма Кароны Польскай. Прэрагатывы манарха і сойма. Узмацненне ролі шляхты ў дзяржаве. Мельніцкі прывілей. “Nihil novi”.

Мерапрыемствы Боны Сфорцы па ўмацаванні каралеўскай улады.

Вяртанне каронных маёмасцей, алміністрацыйная і ваенная рэформы. Разгортванне зямельнай рэформы. Знешнепалітычныя прыярытэты Кароны Польскай. Пранікненне ідэй Рэфармацыі ў краіну. Рэнесанс у Польшчы.

### Тэма 19. Утварэнне і развіццё Рэчы Паспалітай ў другой палове XVI ст.

Перадумовы і прычыны Люблінскай уніі. Фактары збліжэння і дыстанцыравання Кароны Польскай і вялікага княства Літоўскага. Наспяванне дынастычнага крызісу. Карона Польская і Вялікае княства Літоўскае ў альтэрнатыўных варыянтах новага праекта уніі. Лівонская вайна і Люблінскі сойм. Далучэнне да Польшчы украінскіх зямель.

Умовы Люблінскай уніі і рэакцыя на яе ў Вялікім княстве Літоўскім. Смерць Сігізмунда Аўгуста і бескаралеўе. Генрых Валуа. Стэфан Баторы. Заканчэнне Лівонскай вайны. Ваенная рэформа. Карэкціроўка Люблінскай

уніі з боку Вялікага княства Літоўскага. Канфесійнае развіццё Рэчы Паспалітай. Дзейнасць манаскіх ордэнаў. Стварэнне уніяцкай царквы.

Знаенепалітычная прыярытэты Рэчы Паспалітай. Адносіны з Расіяй, Швецыяй, аўстрыйскімі Габсбургамі. Пачатак кіравання ў Рэчы Паспалітай манархаў з дынастыі Ваза.

**Тэма 20. Рэч Паспалітая ў XVII ст.**

Дзяржаўны лад і сістэма кіравання. Спецыфіка дзяржаўных інстытутаў. Сацыяльныя групы і іх становішча. Статус гарадоў і гарадскога насельніцтва. Віды землеўладання і катэгорый залежнага насельніцтва. Фальваркавая сістэма і яе месца ў эканоміцы.

Рэцэпцыя абсалютысцкіх мер як тэндэнцыя ўнутранага развіцця Рэчы Паспалітай. Сігізмунд Ваза. Рокаш Зебжыдоўскага. Меры Уладзіслава Вазы па ўмацаванні асабістай улады. Ідэя масштабнай вайны з Асманскай імперыяй, нарошчванне кароннага войска і грашовых сродкаў манархіі. Спроба ўвесці спадчыннасць трона (vivente rege) каралевай Марыяй Людвікай. Барацьба магнацкіх групповак. Адрачэнне Яна Казіміра. Міхал Вішнявецкі. Ян Сабескі.

Сацыяльныя канфлікты ў Рэчы Паспалітай. Казацка-сялянскія паўстанні. Асяродак напружанасці ва Украіне. Багдан Хмяльніцкі. Казацка-сялянская вайна і пераход Левабярэжнай Украіны пад пратэктарат Расіі.

Знаешнепалітычныя прыярытэты Рэчы Паспалітай. Саюз з Аўстрыйскімі Габсбургамі. Войны з Швецыяй. Аліўскі мір і яго вынікі. Выход Прусіі з-пад пратэктарата Польшчы. Вайна з Расіяй і страта Левабярэжнай Украіны. Супрацьстаянне з Асманскай імперыяй. Разгром туркаў пад Венай войскамі Яна Сабескага. Агульнае аслабленне краіны і страта тэрыторый у другой палове стагоддзя.

**Тэма 21. Усходнеславянскія краіны і народы ў XVI-XVIII ст.**

Розныя ўмовы і вынікі развіцця ўсходнеславянскіх народаў. Стварэнне Расійскай дзяржавы і абвяшчэнне Расійскай імперыі. Фарміраванне і развіццё абсалютнай манархіі. Расія як лідэр усходнеславянскага свету. "Масква-Трэці Рым". "Грэчаскі праект" Кацярыны II.

Беларускія землі ў складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Фактар паланізацыі і ўзрастання ролі каталіцкай царквы. Рэлігійны фактар ў Рэчы Паспалітай як падстава для ўмяшальніцтва суседніх краін. Падзелы Рэчы Паспалітай і ўваходжанне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі.

Украінскія землі ў складзе Польшчы і Вялікага княства Літоўскага.

Прваабярэжная і Левабярэжная Украіна. Гетманства. Запарожская Сеч і яе значэнне ў рэгіёне. Запарожская сеч, Турцыя, Польшча і Расійская дзяржава. Вынікі геапалітычных трансфармацый другой паловы XVII ст.

Знаходжанне Левабярэжнай Украіны ў складзе Расійскай імперыі. Скасаванне гетманства. Увядзенне прыгоннага права. Правабярэжная Украіна ў складзе Аўстрыйскай імперыі, статус і развіццё1 яе зямель у складзе імперыі Габсбургаў.

## Тэма 22. Чэшскія землі ў складзе імперыі Габсбургаў у XVI–XVIII ст.

Статус Чэхіі ў складзе Свяшчэннай рымскай імперыі. Парадак заняцця трона і спецыфіка манархічнай улады. Кіраванне Ягелонаў у Чэхіі. Структура замелеўладання і катэгорыі залежнага насельніцтва. Запрыгоньванне сялян. Рэлігійныя праблемы чэшскага грамадства.

Уключэнне Чэхіі ў склад імперыі Габсбургаў. Чэшскае паўстанне 1618–1620 гг. і ператварэнне Чэхіі ў правінцыю. Сельская гаспадарка і прамысловасць. Становішча сялянства. Рэлігійныя супярэчнасці ў Чэхіі і Багеміі. Паўстанне ў Празе і пачатак Трыццацігадовай вайны. Набыццё Трыццацігадовай вайной агульнаеўрапецскага характару. Вынікі вайны для Чэхіі.

Становішча чэшскіх зямель у складзе імперыі Габсбургаў у XVIII ст. Рэформы асвечанага абсалютызму у Чэхии. Урбарыяльная рэформа Марыі-Тэрэзіі. Мерапрыемствы Іосіфа II у сялянскім пытанні і іх вынікі. Іозефінізм. Пачатак разгортвання нацыянальна-вызваленчага руху.

## Тэма 23. Расійская дзяржава ў XVII ст.

Пачатак Смутнага часу. Ілжэдзмітрый I, яго асоба і дзейнасць. Падрыхтоўка паходу на Расію. Кіраванне Ілджэдзмітрыя I, яго змест і вынікі.

Ілжэдзмітрый II. Барацьба за расійскі трон. Тушынскі лагер. Васіль Шуйскі. Сямібаяршчына. Паўстанне І. Балотнікава. Паход на Смаленск Сігізмунда Вазы. Дамова аб прадастаўленні расійскай кароны Уладзіславу Вазе. Польская і шведская інтэрвенцыя. Дзейнасць I і II апалчэнняў. Вызваленне Масквы. Пачатак дынастыі Раманавых. Дэвулінскае замірэнне і яго значэнне. Смаленская вайна і яе вынікі.

Станаўленне расійскага абсалютызма. Міхаіл Раманаў і стабілізацыя краіны. Праўленне Аляксея Міхайлавіча. Сабарнае Улажэнне і яго значэнне. Афармленне прыгоннага права. Структура землеўладання і катэгорыі залежнага насельніцтва. Пачатак мадэрнізацыі краіны. Царкоўны раскол. Сялянская вайна пад кіраўніцтвам С. Разіна.

Задачы кіравання і барацьба за ўладу у канцы XVII ст. Кіраванне

царэўны Соф'і і дзейнасць В. Галіцына. Асноўныя накірункі знешняй палітыкі Расіі. Адносіны са Швецыяй, Рэччу Паспалітай, Асманскай імперыяй, Кітаем. Крымскія паходы. Вайна з Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг. і яе вынікі. "Вечны мір" 1686 г. Фарміраванне мяжы Расіі на Далекім Усходзе.

## Тэма 24. Паўдневаславянскія краіны пад уладай Асманскай імперыі ў ранні Новы час

Славянскія народы Балканскага паўвострава пад уладай Асманскай імперыі. Уваходжанне ў склад Асманскай імперыі Македоніі, Балгарыі, Сербіі, Грэцыі, Албаніі, Босніі і Герцагавіны. Харватыя як тэрыторыя Турцыі, Аўстрыі і Венецыі.Адміністрацыйны падзел і кіраванне. "Даніна крывёй". Асіміляцыйная і міграцыйная палітыка турэцкіх улад. Ісламізацыя і яе наступствы. Ваенна-ленная сістэма. Падаткаабкладанне розных катэгорый насельніцтва. Асаблівасці сістэмы землеўладання.

Выступленні заваяваных народаў супраць асманскага панавання. Гайдукі, ускокі, клефты. Роля хрысціянскай царквы ў антытурэцкіх паўстаннях. Уплыў адносін з заходнееўрапейскімі краінамі на вызваленчы рух народаў Балканскага паўвострава.

## Тэма 25. Расійская імперыя ў першай палове XVIII ст.

Пачатак праўлення Пятра I. "Вялікае пасольства". Праграма рэформ. Расійскі абсалютызм і яго ідэйнае абргунтаванне. Рэформы ў галіне дзяржаўнага кіравання. Дзяржава і царква.

Задачы знешняй палітыкі. Азоўскія паходы і іх вынікі. Паўночная вайна. Ваенная рэформа. Эканамічнае развіцце краіны. Пратэкцыянізм. Развіццё мануфактур. Меры ўрада ў галіне адукацыі, навукі і культуры. Еўрапеізацыя краіны. Асоба Пятра I, яго дзейнасць і іх ацэнкі ў гістарыяграфіі. Развіццё дзяржавы пры бліжэйшых пераемніках Пятра I (Кацярына I, Петр II, Ганна Іаанаўна).

Праўленне Лізаветы Пятроўны: тэндэнцыі развіцця дзяржавы і элементы "асвечанага абсалютызма". Знешняя палітыка. Руска-турэцкая вайна, вайна за "польскую спадчыну". Семігадовая вайна. Петр III, яго дзейнасць і лёс.

## Тэма 26. Расійская імперыя ў другой палове XVIII ст.

Пераварот 1762 г. Кацярына II і асвечаны абсалютызм. "Наказ" і дзейнасць Улажэннай камісіі. Сялянскае пытанне. Сялянская вайна пад кіраўніцтвам Е. Пугачова і яе наступствы. Сацыяльная палітыка Кацярыны II

пасля падаўлення сялянскай вайны пад кіраўніцтвая Е. Пугачова.

Змены ў палітычным курсе пад уплывам Вялікай французскай рэвалюцыі. Міжнароднае становішча Расіі. Руска-турэцкія войны і выхад да Чорнага мора. “Грэчаскі праект”. Руска-шведскія адносіны. Падзелы Рэчы Паспалітай. Змены ва ўнутранай і знешняй палітыцы пры Паўле І. Супярэчнасці кіравання. Рост палітычнай напружанасці і забойства Паўла І.

### Тэма 27. Рэч Паспалітая ў XVIII ст.

Выбранне на трон Рэчы Паспалітай Аўгуста II Моцнага. Спробы ўмацавання каралеўскай улады і іх вынікі. Умяшальніцтва Пятра І і ўсталявання расійскага патраната. Паўночная вайна і ўдзел у ёй Рэчы Паспалітай. Аўгуст Моцны і Станіслаў Ляшчынскі. Барацьба магнацкіх груповак. Заканчэнне Паўночнай вайны для Рэчы Паспалітай. “Вайна за польскую спадчыну” і выбары на трон Рэчы Паспалітай Аўгуста Саксонца.

Эканамічны стан краіны. Фальваркавая гаспадарка. Разгортванне капіталістычных працэсаў у эканоміцы. Мануфактуры, новыя формы арганізацыі працы, развіццё гарадоў.Рэформы Тызенгаўза ў Вялікім княстве Літоўскім. Рэформы Станіслава Аўгуста Панятоўскага ў галіне эканомікі, фінансаў і шляхоў зносін.

Выбранне апошняга манарха Рэчы Паспалітай і рэфармаванне краіны ў духе “асвечанага абсалютызма”. Праблема дысідэнтаў. Канфедэрацыі. Кардынальныя правы. Першы падзел Рэчы Паспалітай. Уплыў Французскай рэвалюцыі на ўнутрыпалітычнае развіццё Рэчы Паспалітай. Чатырохгадовы сейм. Канстытуцыя 1791 г. Другі падзел Рэч Паспалітай. Паўстанне пад кіраўніцтвам Т. Касцюшка, яго ход і вынікі. Трэці падзел Рэчы Паспалітай.

### Тэма 28. Культура славянскіх народаў у ранні Новы час

Пашырэнне ўплыву заходняй культуры ў дзяржавах заходніх і ўсходніх славян. Адраджэнне. Навалацінская паэзія. Я. Каханоўскі. М. Гусоўскі. Я. А. Каменскі. Ф. Скарына. “Дамастрой” як нарматыўны звод паўсядзеннага жыцця ў Рускай дзяржаве. Іканапіс. Мураванае дойлідства. “Абміршчэнне” культуры”. Адукацыя. Заснаванне Славяна-грэка-лацінскай акадэміі. С. Полацкі. Зараджэнне тэатра.

Росквіт мастацтва барока ў Польшчы. С. Чэховіч. Віленская барока ў Вялікім княстве Літоўскім. Пражскае барока ў Чэхіі. Чэшская скульптура (М. Браун, Ф. Брокоф). Р. Скаварада і В. Капніст і іх роля ў фарміраванні ўкраінскай нацыянальнай ідэнтычнасці. Ф. У. Радзівіл і яе драматургічныя творы. Стварэнне і рэпертуар прыгонных тэатраў у Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі. Мецэнацтва і калекцыяніраванне.

Значэнне пятроўскіх рэформ і палітыкі асвечанага абсалютызма для расійскай культуры. Адкрыццё Акадэміі навук і Маскоўскага універсітэта. Заснаванне Кунсткамеры і Эрмітажа. Дзейнасць М. В. Ламаносава. Класіцызм ў літаратуры (А. П. Сумарокаў, М. В. Ламаносаў, Д. В. Фанвізін, Г. Р. Дзяржавін і г.д.). Асветніцтва (М. І. Новікаў, А. М. Радзішчаў). Выяўленчае мастацтва і музыка (Ф. С. Рокатаў, Д. Р. Лявіцкі, У. Л. Баравікоўскі, А. П. Ласенка, С. Ф. Шчадрын, Д. С. Бартнянскі і інш.). Архітэктура і скульптура класіцызма (М. Казакоў, В. Бажэнаў, Э. Фальканэ, Ф. Шубін). Еўрапеізацыя побыту і нораваў.

## Тэма 29. Польскія землі і спецыфіка іх развіцця ў складзе розных дзяржаў у ХІХ ст. Разгортванне нацыянальна-вызваленчага руху

Знаходжанне польскіх зямель у складзе Расійскай імперыі, Прусіі і Аўстрыі. "Польскае пытанне" ў еўрапейскай дыпламатыі. Польская палітычная эміграцыя. Праблема аднаўлення Польшчы ў дыпламатычным саперніцтве Напалеона і Аляксандра І. Стварэнне Герцагства Варшаўскага.

Польскія землі ў складзе імперыі Габсбургаў. Каралеўства Галіцыі і Ладамерыі. Кіраванне і германізацыя. Польскія землі пад уладай Прусіі. Сацыльная палітыка прускага ўрада. Эканамічнае развіццё, каланізацыя і германізацыя.

Праекты аднаўлення Рэчы Паспалітай і Вялікага княства Літоўскага. План Агінскага. Вайна 1912 г. і стварэнне Часовага ўрада Вялікага княства Літоўскага. Пазіцыя шляхты і магнатаў падчас вайны Расіі з Напалеонам. Стан польскай дзяржаўнасці паводле рашэнняў Венскага кангрэса. Статус Кракава. Царства Польскае як аўтаномія Расійскай імперыі. Палітыка расійскіх улад у першай палове ХІХ ст. Канстытуцыя Царства Польскага. Паўстанне 1830–1831 гг. ў Польшчы і заходніх губерніях Расійскай імперыі і яго вынікі. Нацыянальны рух, польская палітычная эміграцыя. Уплыў рэвалюцыйных падзей 1848 г. на нацыянальна-вызваленчы і грамадскі рух у польскіх землях. Паўстанне 1863–1864 гг. і яго наступствы.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё польскіх зямель у складзе розных дзяржаў. Рэгіянальная, галіновая і сацыяльная спецыфіка. Удзел замежнага капітала. Разгортванне прамысловага перавароту. З'яўленне сацыял-дэмакратычных і ліберальных партый і месца ў ім нацыянальнага пытання.

## Тэма 30. Чэшскія землі ў складзе імперыі Габсбургаў і развіццё чэшскага нацыянальнага руху ў ХІХ ст.

Прававое і палітычнае становішча чэшскіх зямель у складзе імперыі Габсбургаў. Спецыфіка эканамічнага развіцця. Фарміраванне нацыянальнай

ідэі ў пачатку XIX ст., выданне “Айчынных навін”, чэшскіх аўтараў, стварэнне Музея Каралеўства Чэшскага. Уплыў напалеонаўскіх вайн на нацыянальнае абуджэнне у Чэхіі. З’яўленне чэшскай нацыянальнай гістарыяграфіі.

Рэвалюцыя 1848 г. і палітычны рух у Чэхіі. Аўстраславізм. Рух чэшскай інтэлігенцыі і стварэнне Нацыянальнага камітэта. Праблема тэрытарыяльнага ўз’яднання чэшскіх зямель. Крамержыцкі імперскі сейм і яго рашэнні. Мартаўская канстытуцыя і яе лёс. Стварэнне дуалістычнай манархі Аўстра-Венгрыі і месца ў яе сістэме чэшскіх зямель.

Чэшскія і славацкія землі ў сістэме Цыслейтаніі і Транслейтаніі. Дзяржаўны лад і палітычныя інстытуты згодна з канстытуцыяй 1867 г. Барацьба чэхаў за пашырэнне правоў і нацыянальннае самавызначэнне. Стварэнне і дзейнасць палітычных партый і арганізацый з нацыянальна-вызваленчай праграмай. Супярэчнасці і спробы ўладкавання канфліктаў чэхаў і немцаў з боку урада. Выбарчы закон 1907 і закон аб мовах 1914 г. Славянскі з’езд 1908 г. Развіццё чэшскай і славацкай культуры ў рэчышчы нацыянальнай барацьбы. Чэхія ў перыяд першай Сусветнай вайны.

### Тэма 31. Паўдневаславянскія землі ў складзе Асманскай імперыі. “Усходняе пытанне” і нацыянальна-вызваленчы рух паўднёвых славян

Палітычнае становішча паўдневаславянскіх зямель у складзе Асманскай імперыі. З’яўленне і сутнасць “усходняга пытання”. Геапалітычныя інтарэсы заходнееўрапецскіх краін і Расіі на Балканскім паўвостраве. Крымская вайна і яе вынікі. Расія і нацыянальна-вызваленчы рух славянскіх народаў. Дзейнасць нацыянальных партый, культурнае абуджэнне паўдневаславянскіх народаў. Дасягненне аўтаноміі Сербіяй і Румыніяй. Руска-турэцкія войны і іх вынікі для славянскіх народаў Балканскага паўвострава. Атрыманне незалежнасці Румыніяй, Сербіяй, Чарнагорыяй. Аўтаномія Балгарыі і Босніі і Герцагавіны. Стварэнне Сербскага і Балгарскага каралеўстваў.

Аграрны характар эканамічнага развіцця. Паступовае разгортванне прамысловага пераварота. Уплыў замежнага капітала. Фарміраванне нацыянальнай буржуазіі і рабочага класа. Стварэнне сацыял-дэмакратычных арганізацый. Ліберальныя партыі і месца ў іх праграмах нацыянальнага адраджэння і пашырэння нацыянальных дзяржаў.

### Тэма 32. Расійская імперыя ў першай палове XIX ст.

Тэрыторыя і насельніцтва. Класы і саслоўі. Асаблівасці палітычнага ладу. Александр I і ліберальныя праекты пачатку стагоддзя. Дзейнасць

Сперанскага. Рэфомы ў галіне кіравання, адукацыі, закон “аб вольных хлебапашцах” і г.д. Знешняя палітыка Расіі ў пачатку XIX ст. Удзел у антыфранцузскіх кааліцыях. Тыльзіцкі мір і франка-расійскія супярэчнасці. Вайна 1812 г. Роля Расіі на Венскім кангрэсе і ў стварэнні Свяшчэннага Саюза.

Кансерватыўны этап у кіраванні Аляксандра І. Аракчэеўшына. Расія ў Свяшчэнным Саюзе. Рух дзекабрыстаў і яго мэты. Паўстанне дзекабрыстаў і яго вынікі. Развіццё грамадскай думкі ў першай палове XIX ст. Заходнікі і славянафілы. Пачатак дзейнасці рэвалюцыянераў-разначынцаў.

Умацаванне кансерватыўных тэндэнцый падчас кіравання Мікалая І. “Тэорыя афіцыйнай народнасці”.Крызіс прыгонніцтва. Асаблівасці эканомікі дарэформеннай Расіі. Сялянскае пытанне. Рэформы Кісялева. Накірункі знешняй палітыкі Расіі. Расія і еўрапейскія рэвалюцыі. Вайна на Каўказе. “Усходняе пытанне”. Крымская вайна.

### Тэма 33. Расійская імперыя ў другой палове XIX ст.

Аляксандр ІІ. Падрыхтоўка адмены прыгоннага права. Маніфест 19 лютага 1861 г. і Палажэнні аб новай арганізацыі сялянскай гаспадаркі. “Эпоха вялікіх рэформ”. Лібералы і кансерватары. Рэвалюцыянеры-народнікі і плыні ў народніцтве. Забойства Аляксандра ІІІ. Аляксандр ІІІ і яго палітычныя прыярытэты. Контррэформы. Расійская імперыя і нацыянальнае адраджэнне імперскіх ускраін. Народніцкі і сацыял-дэмакратычны рух. Распаўсюджанне марксізма. “Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа”. Стварэнне РСДРП.

Эканамічнае развіцце парэформеннай Расіі. З’яўленне новых сацыяльных груп. Міграцыі насельніцтва і урбанізацыя. Сельская гаспадарка і спалучэнне розных сістэм гаспадарання. “Прускі шлях” развіцця аграрных адносін і яго праявы. Знешні і ўнутраны гандаль і шляхі зносін. Банкі і крэдыт. Замежныя капіталы. Фарміраванне пралетарыята і буржуазіі.

Прыярытэты знешняй палітыкі Расіі. “Саюз трох імператараў”. Франка-рускі саюз. Інтарэсы Расіі на Балканах і Далекім Усходзе. Руска-турэцкая вайна. Далучэнне да Расіі тэрыторый Сярэдняй Азіі. Расія ў Антанце.

### Тэма 34. Усходнеславянскія краіны і народы на мяжы XIX–XX ст. Нацыянальны рух на беларускіх і ўкраінскіх землях

Нацыянальнае пытанне ва ўнутрапалітычным развіцці Расійскай імперыі. Фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі. Група “Гоман”. Стварэнне БСГ (Беларускай сацыялістычнай грамады), яе ідэалогія і дзейнасць. “Наша Ніва” і “нашаніўскі” перыяд у развіцці беларускай

літаратуры. Беларускі нацыянальны рух падчас Першай сусветнай вайны.

Украінскае пытанне і яго спецыфіка на тэрыторыях Расійскай імперыі і Габсбургскай манархіі. Разнастайнасць украінскага нацыянальнага руху. Украінскі нацыянальны рух падчас Першай сусветнай вайны.

Стварэнне Кірыла-Мяфодзіеўскага брацтва і яго роля ў нацынальна-культурным адраджэнні ўкраінскага народа. "Брацтва тарасаўцаў" і яго ідэі. Рэвалюцыйная ўкараінская партыя і Украінская народная партыя. Сацыял-дэмакратычныя партыі і месца ў іх праграмах нацыянальнага пытання. Плыні ва ўкраінскім нацыянальным руху. Культурны ўздым на украінскіх землях.

Украінскі рух на тэрыторыі Заходняй Украіны і пазіцыя аўстрыйскіх улад. Стварэнне Галоўнай Рускай Рады і яе дзейнасць. Пранікненне нацыянальнай ідэі ў шырокія масы. Стварэнне РУРП (руска-украінскай радыкальнай партыі). Плыні ў нацыянальным руху. Нацыянал-дэмакратычныя і сацыял-дэмакратычныя украінскія партыі і вынікі іх дзейнасці.

### Тэма 35. Набыццё незалежнасці паўдневаславянскімі краінамі. Балканскія войны

Развіццё незалежных славянскіх краін на Балканах. Каралеўствы Сербія і Балгарыя как рэгіянальныя лідары. Палітычны лад, сацыяльная структыра, знешнепалітычныя арыенціры новых незалежных краін. Палітычныя партыі і арганізацыі ў незалежных краінах.

Нераўнамернасць і замаруджанасць эканамічнага развіцця. Аграрны характар эканомік, галіновы падзел прамысловасці. Мерапрыемствы ўрадаў па правядзенні аграрных рэформ і мадэрнізацыі краіны. Удзел замежнага капітала. Нацыянальная буржуазія і буржуазныя партыі. Аграрныя і рабочыя партыі ў палітычным жыцці паўдневаславянскіх краін. Складанасці шматнацыянальных і шматканфесійных дзяржаў і сацыяльных адносінаў.

З'яўленне новых рэгіянальных лідэраў на Балканах. Балгарыя і Сербія і іх палітычныя планы. Першая і Другая Балкансккія войны і іх вынікі. Адносіны паўдневаславянскіх дзяржаў і Габсбургскай манархіі. Акупацыя Аўстра-Венгрыяй Босніі і Герцагавіны. Баснійскі крызіс. Нарастанне напружанасці на Балканах. Балканы ў сістэме інтарэсаў Антанты і Траістага Саюза. Балканскія краіны ў перыяд Першай сусветнай вайны.

### Тэма 36. Расійская імперыя ў канцы XIX – пачатку XX ст.

Прыход да ўлады Мікалая II. Праблемы кіравання. Лібералізм і "почвенніцтва". Панславізм. Руска-японская вайна. Імперыя і нацыянальнае пытанне. Дзейнасць РСДРП. Падзел сацыял-дэмакратаў на бальшавікоў і

меньшавікоў. Стварэнне і дзейнасць партыі эсэраў. "Паліцэйскі сацыялізм".

Эканамічны ўздым пачатку XX ст. Рэформы С. Ю. Вітэ. Буйнейшыя манаполіі. Стварэнне фінансавай алігархіі. Развіцце і праблемы аграрнага сектара. Асаблівасці расійскага пралетарыята. Рабочае заканадаўства.

